тапада 1954 года. Быў вызвалены пастановай Яраслаўскага абласнога суда ад 26.10.1954 года ў парадку арт. 457 УПК, судзімасць знята 17.09.1955 года.

Калі Іван Васілевіч вярнуўся ў Гродна, то працаваць па прафесіі не мог. Памёр у Гродне 25 жніўня 1964 года.

Гэты артыкул, зразумела, далёка не поўны пераказ жыццёвага шляху Івана Васілевіча. Варта было б паразмаўляць са сваякамі Аляксандры Васілевіч па лініі яе брата, якія жывуць у Санкт-Пецярбурзе. Пэўныя звесткі могуць быць знойдзены ў архіўным фондзе Віцебскага інстытута ў Цэнтральным гістарычным архіве Масквы, дзе захоўваюцца асабістыя справы выпускнікоў Віцебскага аддзялення Маскоўскага археалагічнага інстытута. І відавочна, тут ёсць праца для гісторыкаў.

## СПІС ДАКУМЕНТАЎ З АРХІВА ІВАНА І АЛЯКСАНДРЫ ВАСІЛЕВІЧАЎ, ПЕРАДАДЗЕНАГА Ў ЖНІЎНІ 2012 ГОДА Ў ГРОДЗЕНСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ГІСТОРЫКА-АРХЕАЛАГІЧНЫ МУЗЕЙ

1. Пасведчанне аб нараджэнні І. Васілевіча. Вільня, Навасвецкая стараабрадніцкая Пакроўская малельня. 28 сакавіка 1905. (КП-90349)

2. Выпіс з метрычнай кнігі за 1898 год аб нараджэнні Аляксандры Нікіфаравай. Віцебск, Бальнічная царква. 30 жніўня 1917 г. (КП-90359)

3. Выпіс з метрычнай кнігі за 1918 год аб шлюбе І. Васілевіча і А. Нікіфаравай. Віцебск, Гарадская Іаана-Багаслоўская царква. 1919 г. (КП-90350)

4. Копія пасведчання і даведкі аб смерці і пахаванні Неанілы Васілевіч, сястры І. Васілевіча. 1918 г. (КП-90355)

5. Дыплом І. Васілевіча аб сканчэнні Маскоўскага Археалагічнага інстытута. Масква. 30 чэрвеня 1922 г. (КП-90351)

6. Студэнцкае пасведчанне А. Васілевіч, студэнткі Віцебскага аддзела Маскоўскага Археалагічнага Інстытута. Віцебск. 17 чэрвеня 1921 г. (КП-90354)

7. План участка зямлі сям'і Нікіфаравых па 3-м Кракелевым завулку г. Віцебска. 1922 г. (КП-90360)

8. Генеральны план участка зямлі гр. Нікіфаравых і праект дома сям'і Васілевічаў па 3-м Кракелевым завулку г. Віцебска. 1923 г. (КП-90361)

9. План раздзелу ўчастка зямлі сям'і Нікіфаравых-Васілевічаў па 2-ім Піянерскім завулку г. Віцебска. 1930-я гг. (КП-90362)

10. Працоўны спіс А. Васілевіч (1915—1929 гг.). 1929 г. (КП-90388)

11. Машынапіс артыкула І. Васілевіча «Настал час расплаты», надрукаванага ў газеце «Витебский рабочий» 29 чэрвеня 1941 г. (КП-90367)

12. Дагавор на куплю маёмасці сям’ёй Васілевічаў. Гродна. 29 ліпеня 1945 г. (КП-90363)

13. Акт вобыску кватэры І. Васілевіча. Гродна. 26 снежня 1945 г. (КП-90365)

14. Працоўная кніжка А. Васілевіч (звесткі аб працы за перыяд 1929—1953 гг.) 1953 г. (КП-90387)

16. Акт агляду дома па вул. Цагляная, 10. Гродна. 3 ліпеня 1948 г. (КП-90366)

17. Пасведчанне аб смерці К. Нікіфаравай. Гродна. 17 лістапада 1952 г. (КП-90356)

18. Даведка Міністэрства юстыцыі СССР аб вызваленні асуджанага І. Васілевіча. 12 лістапада 1954 г. (КП-90352)

19. Даведка Пракуратуры Гродзенскай вобласці аб зняцці судзімасці з І. Васілевіча. 1 верасня 1956 г. (КП-90353)

20. Пенсійнае пасведчанне А. Васілевіч. 1957 г. (КП-90386)

21. Працоўныя пасведчанні, даведкі А. Васілевіч (52 адзінкі). 1915—1955 гг. (КП-90389-90440)

22. Пасведчанне аб смерці І. Нікіфарава. Гродна. 18 лютага 1959 г. (КП-90357)

23. Пасведчанне аб смерці І. Васілевіча. Гродна. 25 жніўня 1964. (КП-90358)

24. Дагавор найму жылога памяшкання А. Васілевіч па вул. Цаглянай, 10, г. Гродна. 1965 г. (КП-90364)

25. Рукапісы вершаў І. Васілевіча (18 адзінак). Віцебск, 1920-я гг. Гродна, 1950—60-я гг. (КП-90368-90385)